независимость; потребность и возможность в решении актуальных задач развития; благополучное решение задач уже пройденных этапов жизни.

Список использованных источников

1. Психология старости и старения: учебное пособие для студ. психол. факул. высш. учеб. Заведений / сост. О.В. Краснова, А.Г. Лидерс. – М.: Издательский центр «Академия», 2003. – 416с.
2. Яцемирская, Р. С., Беленькая, И. Г. Социальная геронтология /Р.С.Яцемирская, И.Г.Беленькая. – М.: изд.центр Владос, 2003. – 224 с.

УДК 173:398

# АКТУАЛІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ СПАДЧЫНЫ ЯК ФАКТАР ФАРМІРАВАННЯ СЯМЕЙНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ У СУЧАСНАЙ МОЛАДЗІ

***Г.Е. Каданчик, С.И. Марцинкевич***
***УО «БГСХА», г. Горки, Республика Беларусь***

У сучасным свеце крызісныя з'явы закранулі і сямейныя адносіны – павялічваецца колькасць разводаў, у няпоўных сем'ях растуць и выхоўваюцца без бацькі дзеці. Не абмінула гэта праблема і нашу краіну. Пошукамі шляхоў выйсця з крызісу займаюцца дэмографы і іншыя навукоўцы.

Сучаснае пакаленне моладзі, як правіла, знаходзіцца пад моцным прэсам аўдыёвізуальнай маскультуры, якая не заклапочана захаваннем і прапагандай вялікай каштоўнасці ў жыцці чалавека – добрай сям'і. Сучасным кіно і тэлебачаннем прапануецца вобраз супергероя, для якога не існуе такога паняцця як "сямейныя каштоўнасці", што не пазбежна пераносіцца ў рэальные каардынаты існавання сучаснага малодага чалавека, які не мае трывалых каранёў.

Безумоўна, фарміраванне сучаснай студэнцкай моладзі адбываецца ў свеце інавацыйных камп'ютэрных тэхналогій і сродкаў масавай камунікацыі. Разам з тым непакоіць наступнае: нярэдка гэта перарывае жыватворную сувязь паміж старэйшым пакаленнем і сучаснаю моладзю, якая не ведае як шматвекавога вопыту нашых продкаў, так і каштоўнасцей хрысціянскай культуры ў адносінах да шлюбу і сям'і. Перакана0ны, што адным са шляхой фарміравання адказных адносін да шлюба можа стаць пашырэнне ролі і месца духоўнай спадчыны нашага народа ў выхаванні маладога пакалення.

Вяртаючы да жыцця народныя традыцыі і святы, можна прапанаваць моладзі тое, што і ў сучасным жыцці можа паслужыць прыкладам пры стварэнні сям'і і прапанаваць, адэкватныя часу і сучасным патрабаванням, рытуалы. Такая практыкаарыентаваная дзейнасць павінна пачынацца са знаёмства моладзі з традыцыйнай шлюбнай абраднасцю, якая мінавіта ў наш час у горадзе мала вядома або вельмі зменена тымі, хто яе праводзіць.

Сямейная абраднасць беларусаў складалася на працягу вякоў. Вясельныя абрады ў параўнанні з іншымі больш складаныя, і ўключалі даволі працяглы перадшлюбны перыяд. Давясельная частка уключала даведкі ("перапыты"), выглядзіны, сватанне, запоіны, агледзіны, заручыны. Галоўным у шматдзённым перадвясельным рытуале з'яўлялася сватанне, у час якога сваты дамаўляліся з бацькамі. Сваталі дзяўчат звычайна на Пакроў (14 кастрычніка), таму ў народзе гаварылі "Прыйшла Пакрова – дзеўка гатова". Варта адзначыць, што амаль да ХХ стагоддзя моладзь уступала ў шлюб ва ўзросце да васемнаццаці год і на гэтай падставе ў той час пытанне аб уступленні ў шлюб вырашалі толькі бацькі.

Бацькі, ў якіх быў дарослы хлопец, на працягу лета і да заканчэння палявых работ рабілі даведкі і выглядалі сабе будучых нявестак, з тых дзяўчат, што больш спрытныя ў працы і маюць добры род, з якім хацелася бы парадніцца. Потым складалі сватнюю дружыну, у склад якой уваходзіла нячотная колькасць сватоў (не лічачы хлопца, якога збіраліся жаніць) і запрашалі хроснага бацьку ў якасці старшага свата.

Амаль да пачатку ХХ стагодзя сватаць дзяўчыну выяжджалі пасля поўначы або ноччу. Пазней склаўся звычай ехаць пасля заходу сонца, калі пачынае змяркацца. Ехалі сватаць абавязкова на конях, нават калі дзяўчына жыла ў суседнім двары – тады абавязкова выязджалі ў адваротны бок, а потым аб'язджалі суседняй вуліцай і навакольнай дарогай дабіраліся да яе хаты.

Калі ж сватам нехта пераходзіў дарогу, а тым больш з пустымі вёдрамі, ці перабегла дарогу кошка, то ўся сватняя дружына вярталася дадому, бо гэта лічылася прадказаннем няўдачы. Вярталіся назад і тады, калі чулі спеў пеўня, або ў дарозе часта іржаў конь. У народзе таксама лічылі, што ў сваты лепш выязджаць маладзіком і пажадана ў чацвер. Зыходзячы са спрадвечных вераванняў у злых духаў, якія могуць перашкодзіць у задуманай справе, ехалі сватаць прыцемкамі, прысядалі перад дарогай, ехалі ў адваротны бок, каб увесці ў зман нячыстую сілу.

Адзначаныя перасцярогі былі выкліканы яшчэ і тым, што не заўсёды сватам удавалася засватаць дзяўчыну. Найчасцей бацькі не адразу давалі станоўчы адказ, а прасілі даць магчымасць паразважаць. Калі ж да дзяўчыны сваталіся некалькі жаніхоў, то адказ бацькі давалі толькі напярэдадні заручын, выбіраючы, за каго выдаць дачку, у залежнасці ад заможнасці і аўтарытэту яго сям'і. Тыя ж, хто атрымліваў адмову, ніколі не лічылі гэта зaганай, хоць, безумоўна, адчувалі сябе няёмка. У старажытныя часы, калі да дзяўчыны сваталіся некалькі хлопцаў, паміж іх дружынамі ў дзень заручын праводзіліся спаборніцтвы на сілу і кемлівасць, і толькі пераможца быў варты рукі нявесты. Гледачом і галоўным суддзёю быў яе род. [2, с.263]

Заручыны – гэта перадвясельны абрад, на якім сустракаліся род жаніха і род нявесты, каб даць згоду на шлюб і абмеркаваць пытанні правядзення вяселля. Дамоўленасць сватоў не мела поўнай сілы, і апошняе слова павінны былі сказаць члены роду женіха і навясты.

Як і сватанне, заручыны праводзіліся ў хаце нявесты, праз тыдзень-другі, пасля прыезда сватоў. Усе арганізацыйныя пытанні вяселля вырашалі абавязкова толькі каллектыўна, паколькі нашы продкі рабілі вяселле ўсім родам. У час заручын маладыя абменьваліся пярсцёнкамі, прынята было каб малады сам купляў нявесце пярсцёнак. На абрад запрашалі і музыкаў, спявалі песні і танцавалі. На аб'езд жаніховай радні маці нявесты падносіла хлеб і падарункі. Са дня заручын (або як яшчэ іх называлі "запоін") маладых называлі заручоная і заручоны.

Наступным абрадам у перадвясельным перыядзе была зборная субота – перадвясельны вечар, у час якога жаніх і нявеста збіраліся і рыхтаваліся да вяселля, кожны паасобна. Па народнай традыцыі жаніх і нявеста не павінны былі бачыцца перад вяселлем сем дзён. Гэта было звязана з вераваннем нашых продкаў, што злыя сілы могуць перашкодзіць вяселлю, а на сёмыя суткі з пачаткам дня яны губляюць сваю сілу.

Пасля рытуалаў зборнай суботы ў гэты ж вечар пачынаўся каравайны абрад. Бліжэй да поўначы ў хату жаніха і нявесты збіраліся каравайніцы. У вясельным абрадзе каравай – гэта рытуальны хлеб, які выпякаўся ў ахвяру духам, якія маглі забяспечыць добрай доляй маладых. Каравай выпякалі паасобна у хаце жаніха і нявесты ноччу напярэдадні вяселля, таму гэту ноч называюць яшчэ каравайнай.Традыцыйны беларускі абрад выпякання караваю уключае ў сябе многія магічныя рытуалы

У многіх рэгіёнах Беларусі выпякалі не адзін, а найчасцей тры ці чатыры караваі. Кожны з іх меў сваё прызначэнне: галоўны, самы вялікі, падавалі на стол, калі надзялялі маладых, адзін-два прызначаліся для частавання гасцей, калі праводзілі розыгрышы над маладымі на другі або трэці дзень вяселля, і адзін каравай раздавалі "запарожцам"- людзям не свайго роду, якія не былі запрошаны на вяселле, а прыходзілі толькі на яго паглядзець. Выпечаны галоўны каравай ставілі на века ад дзяжы, засланае рушніком, і выносілі ў камору, клець або на кут пад абразамі, астатнія ж захоўваліся да вяселля толькі ў каморы ці клеці. [2, с.294]

У народзе захаваліся і бытуюць некаторыя павер'і і гаданні, якія звязаны з караваем: у каго каравай згарыць, то той будзе гарачы (сварлівы) ў сям'і, нельга было мясіць каравай кулакамі, бо "муж будзе біць жонку", нельга было перарабляць каравай, пасля таго, як яго скатаюць і пасадзяць на лапату, або выпякаць новы. Гэта тлумачылася так – каравай выпякаюць на долю, а доля адна ў чалавека. Таксама нельга было дапускаць, каб каравай укралі, бо лічылася, што маладыя не будуць жыць у пары, або як мяркуюць апошнім часам, маладыя развядуцца.

Традыцыйнае вяселле беларусаў пачыналася ў нядзелю. Сёння найбольш спрыяльным днём для пачатка вяселля разглядаецца пятніца. Абрадавыя урачыстасці адбываюцца з другой паловы кастрычніка па дваццаць восьмае лістапада, калі пачынаецца пілінаўскі пост. Іншыя тэрміны правядзення вяселляў вызначаюцца мясаедам (напярэдадні перадвялікоднага посту), і перыядам ад Пятроўкі да пачатку жніва. Традыцыйна вяселле гулялі пераважна два дні: у нядзелю пачыналі, а ў панядзелак заканчвалі. У першы дзень вяселля пасля поўдня жаніх выяжджаў за маладою, якую дзяўчаты адводзілі ў адну з суседніх хат, каб апрануць у вясельнае ўбранне і схаваць ад жаніха.

У спрадвечнай народнай традыцыі жаніх і нявеста надзявалі ўбранні белага (або светлага) колеру, які сімвалізаваў пераход маладых з юнацтва ў дарослае сямейнае жыццё. Адзенне жаніха і нявесты

ўключала элементы (пояс, вышыўка, прошва, упрыгожанні і г.д.) выкананыя чырвоным колерам, якія, як лічылася ў народзе, захоўваюць маладых ад уздзеяння недобразычліўцаў.

Калі жаніх са сватамі і шаферамі пасля пошукаў знаходзіў нявесту ў адной з суседніх хат, то за дзвярыма перад парогам, у сенцах, сталом або лавай ім перагароджвалі праход у хату сяброўкі нявесты, якія патрабавалі выкуп за яе (гэты звычай захаваўся да нашага часу). Выкупіўшы нявесту, жаніх браў яе за руку і вёў у хату яе бацькоў, дзе тройчы абводзіў вакол стала па ходу сонца і садзіўся з ёю на куце. Сядалі за стол і госці і адбывалася першае вясельнае застолле. Пасля ехалі вянчацца, і нявеста, выходзячы з хаты, не павінна была азірацца, каб не вярнуцца ў хуткім часе ўдавою.

Рытуал вянчання многія стагоддзі быў адзіным рэлігійна-грамадзянскім актам, які дазваляў і ўзаконьваў пачатак сямейнага жыцця паміж хлопцам і дзяўчынай. І хоць ў савецкі час імкнуліся падмяніць вянчанне толькі рэгістрацыяй шлюбаў у ЗАГах, у канцы XX стагодзя зноў пачалі вяртацца да сваіх спрадвечных каранёў, і вянчанне ў царкве або касцёле становіцца неад'емнай часткай і сучаснага вяселля. Лёсавызначальныя крокі ў жыцці маладых, такім чынам аб'ядноўваюцца ў адзінае рытуальнае дзеянне вянчальным абрадам, які надае важнасць прынятаму рашэнню і сур'ёзную адказнасць за іх будучае сямейнае жыццю не толькі перад людзьмі, але і перад богам. У народзе існавалі перасцярогі перад вянчаннем: непажаданна было па дарозе ў царкву сустрэць жанчыну з пустымі вёдрамі, бацюшку або зайца, а пры ўваходзе ў царкву жаніх і нявеста не павінны былі ступаць на парог, каб не было сямейных сварак і г.д. Падобныя назіранні вяліся і ў час вянчання: па тым, як гарэлі свечкі ў маладых, гадалі аб іх будучым лёсе. Калі свечкі гарэлі ярка, то лічылася, што яны будуць жыць добра, а калі патрэсквалі, то будуць часта сварыцца. Зусім дрэнным знакам лічылася патуханне свечкі ў жаніха ці нявесты – у такім выпадку гаварылі, што ён хутка заўдавее.

Трэба адзначыць, што сёння сучаснае заканадаўства патрабуе спачатку зарэгістраваць шлюб у ЗАГе, і толькі атрымаўшы пасведчанне аб шлюбе, яны могуць быць павенчаны. Калі ў час рэгістацыі маладым прапанавалі стаць на ручнік, то трэба ведаць, што па народнаму звычаю з яго можна сыходзіць толькі парай, а не па аднаму. Па завяршэнні абрада сваты павінны забраць рушнік з сабою. Зараз пасля рэгістрацыі маладажоны накіроўваюцца к месцам рытуальнага пахавання продкаў, мемарыяльным комплексам ці іншым месцам, звязаннымі з гісторыяй або культурнай спадчынай рэгёна. Гэта традыцыя звязана ў сваёй аснове з пачытаннем продкаў, якое займае дамінуючае месца ў большасці каляндарных сямейна-родавых святаў нашых продкаў.

Зараз пры вяртанні маладых з ЗАГа іх сустракаюць бацькі, хлеб-соль трымае маці маладой, а бацька бутэльку з гарэлкай і дзве чаркі. Бацька налівае маладым гарэлку (у мінулым гэта была медавуха), але піць яе нельга. Па павер'ю яе толькі падносяць к губам і правай рукою выліваюць праз плячо за спіну. Лічыцца ў народзе, што з правага боку ў чалавека знаходзіцца анёл-ахоўнік, а з левай – змей-спакуснік, таму пітво трэба выліць праз левае плячо, нячыстай сіле. Гэты рытуал паутараюць двойчы. У мінулым маладых сустракалі ў варотах пры ўваходзе ў двор. Папярэдне бацькі выносілі на мяжу варот стол, засланы абрусам, клалі круглы бохан хлеба, свянцоную соль, ставілі бутэльку гарэлкі і дзве чаркі. [1, с.420]

У традыцыйнай абраднасці вялікае значэнне надаецца вяртанню маладых пасля вянчання. Яны ужо разам ехалі на першай павозцы з хроснымі бацькамі і старшымі шаферамі. Па дарозе пры ўездзе ў вёску аднавяскоўцы перагароджвалі дарогу і патрабавалі выкуп. Звычайна рабілі гэта людзі не свайго роду, а чужыя. Перамовы вёў сват і даваў ім пачастунак, у адказ яны перадавалі маладым хлеб-соль і акраплялі вадою з поўнага вядра, зычылі шчасця. Звычай гэты паходзіць з вельмі старажытных часоў і захаваўся ў вясельным абрадзе да нашага часу, пад назвай "лавіць зайца".

Маладых сустракалі ў варотах бацькі з грамнічнай свечкай, апранутыя ў вывернутыя поўсцю наверх кажухі, што па народных уяўленнях адпужвае нячыстую сілу. І сення ў гэтым звычаях захавалася спрадвечнае жаданне нашых продкаў-славян сустрэць новую сям'ю хлебам-соллю. Пасля рытуальнага пачастунку бацька падзвігаў убок стол і запрашаў маладых прайсці ў хату, дзе адбывалася другое вясельнае застолле, самае працяглае па часу. Трэцяе і апошняе вясельнае застолле ў хаце дзяўчыны-нявесты пачыналася з дзялення караваю. Каравай выкарыстоўваўся ў абрадзе як ахвяравальны пачастунак духам-ахоўнікам роду, каб яны надзялілі маладажонаў шчасцем і доляй. На жаль, у наш час таямніцы выпякання гэтага некалі абавязковага рытуальнага хлеба паціху страчваюцца, і ўзамен яму прыходзіць звычайны гарадскі торт.

Падзяліўшы каравай, старшы сват запрашаў гасцей сесці за сталы, але застолле гэта было кароткім – звычайна пасля першай чаркі маладыя ўставалі з-за стала і збіраліся ад'язджаць да маладога. Развітанне дзяўчыны з роднай хатай і бацькамі было найбольш эмацыянальнай часткай вяселля, якая суправаджалася слёзнымі галашэннямі дачкі і яе маці.

У двары жаніха маладажонаў сустракалі яго маці і бацька, якія абсявалі маладых жытам і праводзілі ў хату. Другі дзень вяселля ў панядзелак праходзіў у доме маладога, як і ў першы дзень таксама праходзіла тры застоллі. У гэты дзень прывозілі куфар з прыданым нявесты, якое маці дзяўчыны даставала і паказвала гасцям. Лічылася вялікім гонарам, калі прыданае падабалася гасцям і яны хвалілі яе дачку, як спрытную рукадзельніцу. За трэцім застоллем жаніхова радня падавала каравай і надзяляла маладых.

Сярод шматлікіх песень, што гучалі на вяселлі ў хаце жаніха, былі і песні-прашэнні да яго бацькоў і роду не крыўдзіць дачку, якую бацькі назаўсёды пакідалі ў чужым доме. Вечарам нявестчыны госці развіталіся з маладажонамі, бацькамі і родам жаніха і ад'язджалі з песнямі дадому. Так заканчвалася беларускае вяселле, адзін з самых прыгожых, вясёлых і ўрачыстых сямейных абрадаў. [2, с.323]

Будзем спадзявацца, што скарбніца мудрых парад, правіл паводзін, захаваных нашымі продкамі, разбудзяць нашу цікавасць да скарбніцы іх жыццёвага вопыту. Няпісанныя законы сямейнай этнапедагогікі, якія перадаваліся ад пакалення да пакалення і захоўваюцца сёння як неад'емная частка ўкладу жыцця беларусаў, могуць дапамагчы пазбегнуць шматлікіх памылак маладым. Безумна, сучаснае пакаленне моладзі не стане прыхільнікамі патрыярхальнага ўкладу жыцця сям'і як у мінулыя часы. Але асэнсаванне таго, што ў жыцці нашых продкаў стварэнню новай сям'і з даўніх часоў надавалася вялікае значэнне, і гэта быў адказны і шматэтапны абрад, калі ўсё магло быць узважана, можа дапамагчы больш разважліва паставіцца да яго і сёння. Вясельны рытуал уключаў працяглы дашлюбны час, затым святкавалася само вяселле, а потым пачыналіся паслявясельныя рытуалы, якія расцягваліся практычна на ўвесь год. Нашы продкі выхоўвалі ў моладзі пачуццё, што сям'я ствараецца для працягу свайго роду і сям'і. Пасля вяселля род жаніха і род нявесты, паяднаўшыся паміж сабой, стаўшы сваякамі, у далейшым жыцці маглі разлічваць на падтрымку і дапамогу адзін аднаму.

Маючы гэта на ўвазе, сваю адказнасць перад богам і раднёй, маладыя не разглядалі ўступленне ў шлюб як нейкі эпізод у сваім жыцці, а разлічвалі, як і бацькі, пражыць ў шлюбе ўсё жыццё. Таму наша задача – па магчымасці вярнуць гэтыя веды сучаснай моладзі з мэтай пасадзейнічаць адраджэнню духоўных традыцый беларускай сямейнай абраднасці.

Пры гэтым хацелася б спадзявацца, што моладзь знойдзе ў нашай традыцыйнай спадчыне апірышча, тыя жыватворныя крыніцы, што дапамогуць ёй перадоліць цяжкасці, з якімі сустракаецца маладая сям'я ў наш час.

Спіс скарыстаных крыніц


1. Катовіч А., Крук Я. Залатыя правілы культуры – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2007. – 584 с.
2. Сысоў У.М. З крыніц спрадвечных. – Мн.: Выш. Школа, 1997. – 415с.


УДК 316.277.4.

## АНАЛИЗ ПОВСЕДНЕВНОСТИ В СОВРЕМЕННЫХ ТЕОРИЯХ НЕМЕЦКОЙ СОЦИОЛОГИИ

*Т.В. Бурак*
*УО «БГУ» г. Минск, Республика Беларусь*

Продолжающийся интерес к проблемам повседневности в современной социологии проявляется в разнообразных дискуссиях о применимости теоретических моделей интерпретации явлений повседневного опыта в практике социологических исследований, в попытках преодоления оппозиции макро- и микросоциологии, объективизма и субъективизма, в конструировании новых подходов к пониманию и объяснению феноменов повседневной действительности. Концепции повседневности, развиваемые на протяжении XX века, включили в предметную область изучения такие многообразные явления, как: интеракции лицом к лицу; когнитивные структуры (фреймы, знания правил поведения и ожидания, готовность и способность определения значения событий) повседневного поведения; влияние субъектов интеракции на презентацию и идентификацию друг друга; контекст повседневной коммуникации; повседневность в текстах; режимы вовлеченности; практическое сознание и др. В качестве активного элемента современных теорий повседневности, получивших свое развитие с конца 80-х годов XX века, используются понятия и методологические установки феноменологии А. Шюца, этнометодологии Г. Гарфинкеля, анализа разговора А.